**БРАЦКАЯ МАГІЛА**
**(Г. СМАЛЯВІЧЫ, ВУЛ. 40 ГОД ПЕРАМОГІ)**



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь):** 613Д000570

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, г. Смалявічы, вул. 40 год Перамогі, каля будынка школы №3

**Каардынаты:** 54.018778, 28.063972

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў г. Смалявічы па вул. 40 гадоў Перамогі – помнік гісторыі. Знаходзіцца каля будынка сярэдняй школы № 3. У 1961 г. на магіле пастаўлен помнік. Пахавана 76 воінаў, што загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941-1944 гг.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў г. Смалявічы па вул. 40 гадоў Перамогі – помнік гісторыі (**613Д000570**), які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Помнік размешчаны на ўзвышшы ў паўднёва-заходняй часткі г. Смалявічы, паўднёвей чыгункі і станцыі Смалявічы. Знаходзіцца каля будынка сярэдняй школы № 3.

У 1961 г. на магіле пастаўлен помнік, які выкананы з чорнага граніту, стаіць на пастаменце, абліцаваны пліткай карычневага колеру. На помніке залатога колеру выгравіраваны надпіс “Вечная слава павшим героям 1941-1945”, пад надпісам намаляваны каласок. Агароджа адсутнічае. Пры падыходзе да гісторыка-культурнай каштоўнасці маюцца ступенькі.

У брацкай магіле пахаваны 76 воінаў, што загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941-1944 гг. Сярод пахаваных – воіны 2-га гвардзейскага Тацынскага танкавага корпуса 11-й гвардзейскай арміі і 352-й стралковай дывізіі 31-й арміі 3-га Беларускага фронту, якія загінулі ў пачатку ліпеня 1944 г. пры вызваленні Смалявіч і раёна.

У Вялікую айчынную вайну 26.06.1941 года Смалявічы былі акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. За годы акупацыі загінула больш 2 тыс. мірных жыхароў, было створана гета, расстрэляна 3 тыс. грамадзян еўрэйскай нацыянальнасці. На торфапрадпрыемствы дзейнічала падпольная арганізацыя.

Вызвалены Смалявічы 02.07.1944 часткамі 2-га гвардзейскага Тацінскага танкавага корпуса 11-й гвардзейскай арміі і часткамі 352-й стралковай дывізіяй 31-й арміі 3-га Бералускага фронту ў ходзе буйнамаштабнай Беларускай аперацыі пад кодавай назвай “Багратыён”, пачатай 23 чэрвеня 1944 г.

На першым этапе (23.06.1944 – 04.07.1944) была праведзена мінская аперацыя, у выніку якой быў вызвалены Смалявіцкі раён.

У баявых дзеяннях на тэрыторыі раёна прымалі ўдзел часткі 31-й, 11-й, 5-й гвардзейскай танкавай арміі.

Значную дапамогу войскам аказвалі партызаны і мясцовае насельніцтва. Усе дарогі і прасёлкі, па якім ажыццяўляўся рух войск, былі разміраваны і расчышчаны ад завалаў, умацаваны балоцістыя месцы. Партызаны паведамлялі каштоўныя звесткі аб характары абароны гітлераўцаў.

Праціўнік, не стрымліваючы напору танкавых мотастралковых брыгад у ноч на 02.07.1944 г. пачаў адступленне да Мінска. Задача авалодаць Смалявічамі ставілася 352-й стралковай дывізіі. Дывізія праследвала праціўніка па маршруту Заручча, Судабоўка.

Авангард – 1162-гі стралковы полк, у 4:00 гадзіны раніцы сустрэў супраціўленне праціўніка на рубяжы Жодзіна – Судабоўка. Полк авалодаў Судабоўкай. Прадаўжаючы праследаванне, дывізія здзейсніла марш па маршруту Судабоўка, Яловіца, Дземідава Жэсць, Осава, Пліса, Апутак. У авангардзе па-ранейшаму дзейнічаў 1162-гі полк.

У 16:00 гадзін полк ужо падышоў да Смалявіч. Да бою развярнуліся 1160-ты (1-шы эшалон) і 1158-мы (2-гі эшалон) стралковыя палкі. Ва ўзаемадзеянні з 927-м артылерыйскім палком стралковыя палкі вялі бой за Смалявічы і да 4:00 выйшлі на рубяжы: 1162-гі полк – Смалявічы – 1 км на паўднёва-захад ад в. Уборкі, 1160-ты – на паўночны ўсход.

4-я гвардзейская мотастралковая брыгада 2-га гвардзейскага Тацінскага танкавага корпуса ноччу 1 ліпеня атрымала дадатковы загад камандзіра корпуса рухацца па маршруту Забашэвічы, Шыпяны, Студзенка.

У 14:00 гадзін 2 ліпеня брыгада пачала наступленне на пазіцыі праціўніка на лініі Смалявічы – торфазавод – в. Забалацце.

Да 20:00, авалодаўшы Чарнікаўшчынай, Мікалаевічамі і Забалаццем, савецкія воіны прадаўжалі баі ў раёне чыгункі і станцыі Смалявічы. У баях за вызваленне Смалявіч і раёна праявілі мужнасць і гераізм многія савецкія воіны, некаторыя з іх былі ўдастоены звання Герой Савецкага Саюза, узнагароджаны медалямі і ордэнамі.

Загінуўшыя пры вызваленні Смалявіч савецкія воіны пахаваны ў трох брацкіх магілах.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

3. Официальный сайт Смолевичского районного исполнительного комитета [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://smolevichi.gov.by/images/29-11-2021-022.pdf. – Дата доступа: 15.10.2022.

4. Памяць. Беларусь : рэспубліканская кніга / С. П. Самуэль [і інш.]; пад агул. рэд. Б. І. Сачанка. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. – 623 с.

5. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.

6. BelGid — Путеводитель Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://a-taurus.by/pamjatnik-na-bratskoj-mogile-okolo-shkoly-3/. – Дата доступа: 15.10.2022.